Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
Научно-инженерное республиканское унитарное предприятие
"Институт прикладных программных систем"
(НИРУП "ИППС")

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ РЕГИСТР ИНФОРМАЦИОННЫХ РЕСУРСОВ**

# РЕГИСТРАЦИОННОЕ СВИДЕТЕЛЬСТВО

## № 1142125244 от 05.04.2021 г.

о включении в Государственный регистр информационного ресурса

**Электронный учебно-методический комплекс «Актуальныя праблемы выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» для студентов II ступени получения высшего образования, специальности: 1-21 80 15 История исторического факультета**

Владелец информационного ресурса

**Учреждение образования "Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка"**

Автор информационного ресурса

**Ратько Александр Федорович**

Директор И.А. Михайловский

М.П.

Рэспубліка Беларусь Навукова-інжынерное рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Інстытут прыкладных праграмных сістэм" Мінск

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Рэг. № УМ(Х)-26-1-32/2021

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ________________ С.А.Талмачова | ________________ В.П.Скок |
| 22. 02. 2021г. | 22. 02. 2021 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**

для спецыяльнасці: 1-21 80 15 Гісторыя

Складальнік:
А,Ф. Рацько, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ «25» 02 2021 г., пратакол № 5.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Актуальныя праблемы выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» распрацаваны для студэнтаў другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) па спецыяльнасці 1-21 80 15 Гісторыя.

Вучэбна-метадычны комплекс накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў сістэмных ведаў гістарыяграфіі гісторыі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, аб'ектыўным уяўленні аб развіцці гістарычнай навукі, якая вывучае ваенную гісторыю

# ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ....................................................................5
ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ:........................................................................7
Канспект лекцый ..................................................................................7
ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ........................................................................20
Планы семінарскіх заняткаў .................................................................20
РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ:..........................................................28
Прыкладны спіс пытанняў да іспыту ......................................................28
Пералік заданняў самастойнай работы студэнта...................................30
ДАПАМОЖНЫЯ РАЗДЗЕЛ: .................................................................31
Вучэбная праграма ...............................................................................31
Вучэбна-метадычная карта (дзённая форма атрымання адукацыі)......34
Літаратура ...........................................................................................38
Метадычныя рэкамендацыі па выкананні заданняў КСР трэцяга ўзроўня...........................................................................................39

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне «Актуальныя праблемы выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» распрацаваны для студэнтаў другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) па спецыяльнасці 1-21 80 15 Гісторыя.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя праблемы выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» – садзейнічаць развіццю ўніверсальных, паглыбленых прафесійных і спецыялізаваных кампетэнцый магістрантаў, заснаваных на фундаментальных ведах гістарыяграфіі гісторыі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, аб‘ектыўным уяўленні аб развіцці гістарычнай навукі, якая вывучае ваенную гісторыю.

У адпаведнасці з сфармуляванай мэтай былі пастаўленыя наступныя **задачы:**

– навучыць магістрантаў выдзяляць перыяды і этапы развіцця даследаванняў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, вызначаць фактары, якія абумовілі сутнасць, асаблівасці метадалагічных канцэпцый гістарычнай навукі ў розныя перыяды;

– забяспечыць асэнсаванне магістрантамі неабходнасці далейшага развіцця ўніверсальных і прафесійных кампетэнцый, даследчай культуры;

– садзейнічаць развіццю спецыяльных ведаў і ўменняў, неабходных для ажыццяўлення навукова-даследчай дзейнасці ў галіне методыкі выкладання гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны;

– стварыць умовы для далейшага ўдасканалення прафесійнай падрыхтоўкі магістрантаў на другой ступені вышэйшай адукацыі.

У выніку вывучэння дысцыпліны магістрант павінен:

***ведаць:***

• канкрэтна-гістарычныя асаблівасці, працэс стварэння, афармлення, эвалюцыі і сучасны стан вывучэння праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

• прыёмы і методыкі выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

• эвалюцыю розных накірункаў і школ у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі;

• этапы станаўлення форм дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі;

• месца і ролю беларускага народа ў барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў;

• асноўныя жыццёвыя і біяграфічныя вехі герояў Вялікай Айчыннай вайны.

***умець:***

• прымяняць розныя падыходы да вывучэння гісторыі пры характарыстыцы асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

• выкарыстоўваць сучасную метадалогію гістарычнай навукі для аналізу значэння гераічнай барацьбы супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў;

• выяўляць асноўныя тэндэнцыі станаўлення і развіцця сучаснай гістарыяграфіі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

• даваць навуковую ацэнку сучасным работам, прысвечаным актуальным праблемам выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць:***

• навыкамі падбору, аналізу і сістэматызацыі інфармацыі па праблеме выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

• метадамі навукова-пошукавай дзейнасці.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя праблемы выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» павінна забяспечыць фарміраванне ў магістрантаў спецыяльных кампетэнцый.

**Патрабаванне да спецыяльных кампетэнцый**

Магістр павінен:

СК–1 Быць здольным да правядзення аналізу палітычнай гісторыі і міжнароднай дзейнасці Рэспублікі Беларусь у розныя перыяды яе гістарычнага развіцця

СК–2 Быць здольным да аналізу і абагульненню сацыяльна-значных працэсаў у Рэспубліцы Беларусь у розныя перыяды яе гістарычнага развіцця

СК–3 Умець вызначаць канфесійныя этнакультурныя заканамернасці і асаблівасці развіцця беларускага грамадства

**Метады (тэхналогіі) навучання**

Асноўнымі *метадамі* навучання з'яўляюцца:

- праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы і даследчы метады);
- тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання;
- камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусіі, мазгавы штурм, круглы стол).

Курс выкладаецца з пазіцый праблемна-арыентаванага і міждысцыплінарнага падыходаў, з улікам шырокага спектру трактовак і ацэнак сучаснай методыкі выкладання гістарычных дысцыплін.

**Структура вучэбнай дысцыпліны**

Усяго вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Актуальныя праблемы выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» па дзённай форме атрымання адукацыі адводзіцца адводзіцца 90 г., (2 з.а.) з якіх аўдыторных – 36 г. (16 г. – лекцый, 20 г. – практычных заняткаў) і пазааўдыторных – 54 г. (самастойная работа).

Бягучая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме заліку ў 2-м семестры. «»

## ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

### Тэма 1. Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія і метады даследавання

*Ключавыя паняцці:* перыядызацыя гісторыі, гістарыяграфічныя крыніцы, метад, метадалогія гісторыі, навуковыя метады.

**План лекцыі:**

1. Праблемы перыядызацыі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
2. Віды гістарыяграфічных крыніц.
3. Сістэма навуковых метадаў.

***1. Праблемы перыядызацыі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.*** У гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны традыцыйна вылучаюць савецкі і постсавецкі перыяды. Савецкімі гісторыкамі даследаваліся падзеі на пачатку вайны, нацысцкі акупацыйны рэжым, партызанская і падпольная барацьба, прычым існаваў кансэнсус у трактоўцы разгляданых падзей ваеннага перыяду. Фактычна ўсе даследаванні, у той ці іншай ступені ўтрымліваюць інфармацыю пра жыццё грамадзянскага насельніцтва ва ўмовах акупацыі, незалежна ад таго, ці змагаўся канкрэтны чалавек, з ворагам са зброяй у руках, ці ж спрабаваў выжыць у найжорсткіх умовах акупацыйнай штодзённасці.

У перыяд незалежнай Рэспублікі Беларусь многія аспекты ваеннай гісторыі пераасэнсоўваюць па-новаму, на фоне адмовы ад старых ідэалагічных штампаў, з улікам пашырэння базы крыніц. Найбольш інтэнсіўна даследаваўся нацысцкі акупацыйны рэжым. Генацыд, эканамічная і працоўная эксплуатацыя, праблема калабарацыянізму, сапраўды, даследаваны ў дастатковай меры, і ў цяперашні час гэтыя аспекты маюць патэнцыял толькі ў плане некаторай дэталізацыі ўжо вядомых фактаў і трактовак. Так, было пашырана ўяўленне пра трагічныя падзеі лета 1941 г. на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў Брэсцкай крэпасці, у ходзе Магілёўскай бітвы, выйшлі даследаванні, прысвечаныя вызваленню Беларусі ад нямецкіх акупантаў, удзел беларусаў у польскіх рэгулярных фармаваннях перыяду Другой сусветнай вайны. У постсавецкі перыяд у цэнтры ўвагі айчынных гісторыкаў знаходзіліся дзеючыя на тэрыторыі Беларусі падпольныя і партызанскія фарміраванні, варожыя адначасова як акупацыйнаму рэжыму, так і савецкай уладзе. Працягнулася вывучэнне руху Супраціву ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: асабісты склад партызанскіх фарміраванняў, баявое ўзаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызан, кіруючыя структуры і персаналіі, рэгіянальны аспект партызанскага руху, надпісы савецкіх патрыётаў на сценах турмаў як гістарычная крыніца.

*2. Віды гістарыяграфічных крыніц.* Пры разглядзе актуальных праблем выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны неабходна выкарыстоўваць разнастайныя гістарыяграфічныя крыніцы: 1) фундаментальныя абагульняльныя працы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі Беларусі, гісторыі партызанскага руху і падпольнай барацьбы; 2) манаграфіі, прысвечаныя адносна вузкім праблемам тэмы; артыкулы ў перыядычным друку і зборніках; 3) апублікаваныя выступленні на навуковых канферэнцыях; 4) брашуры; 5) літаратура нарысавага характару; 6) дысертацыйныя даследаванні, якія з'яўляюцца асновай гістарычнай навукі і найбольш яскрава адлюстроўваюць узровень яе развіцця ў той ці іншы перыяд; 7) дакументы і матэрыялы, апублікаваныя ў розных зборніках і перыядычным друку; 8) працы пра развіццё гістарычнай навукі ў СССР, БССР, навуковых цэнтраў рэспублікі, уклад ВНУ, кафедраў, архіўных устаноў у вывучэнне выбранай тэмы; 9) энцыклапедычныя выданні; 10) гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць»; 11) мемуарная літаратура.

Хоць успаміны перш за ўсё з'яўляюцца гістарычнай крыніцай, аднак тыя з іх, у якіх падаюцца ацэнкі важных фактаў па дадзенай тэматыцы, могуць разглядацца як гістарыяграфічныя. Неабходна адзначыць, што крыніцы нясуць адбітак часу. Так, да пачатку 1990-х гг. многія старонкі ваеннай гісторыі ці замоўчваліся, ці асвятляліся згодна з партыйнымі і дзяржаўнымі ўстаноўкамі.

Важнай крыніцай пры даследаванні заяўленай тэмы паслужылі архіўныя матэрыялы, дзе захоўваюцца дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

*3. Сістэма навуковых метадаў.* Метадалогія даследавання гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны грунтуецца на гісторыка-антрапалагічным і псіхалагічна-асобасным падыходах. Шырокае ўжыванне маюць таксама і метады гістарычнай дыялектыкі: гістарызм і аб'ектыўнасць, якія грунтуюцца на неабходнасці комплекснага аналізу ўсёй сукупнасці падзей і з'яў мінулага, ўсебаковым разглядзе дакументаў і матэрыялаў. Гэта дазваляе ўбачыць сутнаснае ўтрыманне пастаўленых пытанняў.

Пры разглядзе актуальных праблем выкладання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны выкарыстоўваюцца такія метады, як апісальны, гісторыка-параўнальны, статыстычны, лагічны, сінтэз, аналіз, дэдукцыя, індукцыя, абагульненне, мадэляванне, абстрагаванне і аналогія. Метад пошуку грунтуецца на ведах аб прадмеце даследаванні, і не абыходзіцца без гіпотэз, але толькі пабудаваных на аснове фактаў. Пералічаныя метады выкарыстоўваюцца як у сукупнасці, так і паасобку – у залежнасці ад спецыфікі разглядаемага пытання і характару крыніцы.

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Якія перыяды традыцыйна вылучаюць ў гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны?

2. Якія аспекты ваеннай гісторыі былі пераасэнсаваны па-новаму ў перыяд незалежнай Рэспублікі Беларусь?
3. Пералічыце і дайце кароткую характарыстыку гістарыяграфічным крыніцам па пытанням гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны?
4. На якіх падыходах грунтуецца метадалогія даследавання гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны?

## Тэма 2. Арганізацыя навуковых даследаванняў і стварэнне крыніцазнаўчай базы па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

*Ключавыя паняцці:* архіўныя фонды, каардынацыйныя саветы, Археаграфічная камісія,

**План лекцыі:**

1. Падрыхтоўка спецыялістаў па ваеннай праблематыцы.
2. Каардынацыйныя саветы.
3. Стварэнне крыніцазнаўчай базы па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
4. Публікацыя дакументаў і матэрыялаў. Археаграфічная камісія.

***1. Падрыхтоўка спецыялістаў па ваеннай праблематыцы.*** У 1940-я – 1980-я гг. асноўнымі цэнтрамі даследаванняў па вылучанай праблеме з'яўляліся Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР і Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ, якія ажыццяўлялі і каардынацыю навуковай дзейнасці.

У азначаны перыяд праведзена значная праца па павелічэнні і ўдасканаленні формаў падрыхтоўкі даследчыкаў, камплектаванні архіўных фондаў, іх сістэматызацыі, публікацыі дакументаў і матэрыялаў, што спрыяла паглыбленаму даследаванню праблем ваеннага перыяду, аказвала істотны ўплыў на пашырэнне тэматыкі даследаванняў, абумоўлівала колькасны рост абароненых дысертацый.

***2. Каардынацыйныя саветы.*** Эфектыўнасць навуковай дзейнасці ў значнай ступені залежала ад наяўнасці дактароў і кандыдатаў навук. Павелічэнне і ўдасканаленне формаў падрыхтоўкі даследчыкаў, пашырэнне сеткі спецыялізаваных саветаў абумоўлівалі колькасны рост абароненых дысертацый, у першую чаргу кандыдацкіх. У 1947–1990 гг. абаронена 7 доктарскіх і 73 кандыдацкія дысертацыі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі рэспублікі. Разам з тым у савецкія часы не адбылося істотнага прарыву ў падрыхтоўцы дактароў навук. Распад СССР і выкліканы ім разрыў навуковых сувязяў адбіўся і на сістэме падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Сістэма распрацаваных мерапрыемстваў для падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі дазволіла не толькі не дапусціць рэзкага скарачэння колькасных паказчыкаў падрыхтаваных спецыялістаў па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў параўнанні з ранейшымі дзесяцігоддзямі, але і павялічыць іх. Усяго за 1991–2015 гг. абаронена 6 доктарскіх і 40 кандыдацкіх дысертацый. Разам з тым выклікае

заклапочанасць не толькі колькасная, але і ўзроставая статыстыка доктарскага корпусу: усе дактары навук маюць пенсійны ці перадпенсійны ўзрост.

***3.Стварэнне крыніцазнаўчай базы па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.*** За пасляваенны перыяд была створана значная крыніцазнаўчая база па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Дакументы і матэрыялы захоўваюцца ў 31 дзяржаўным архіве. Самым значным па колькасці фондаў з'яўляецца Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, у якім налічваецца звыш 22 тыс. спраў. Нягледзячы на тое, што ў савецкія часы многія архівы заставаліся недаступнымі для даследчыкаў, у навуковы ўжытак была ўведзена вялікая колькасць дакументаў. З набыццём Рэспублікай Беларусь незалежнасці для навукоўцаў былі адкрыты фонды раней закрытых дзяржаўных і ведамасных архіваў, у тым ліку Камітэта дзяржаўнай бяспекі і Міністэрства ўнутраных спраў. Значную працу за гэты перыяд правялі архівісты рэспублікі, якія падрыхтавалі і апублікавалі шэраг зборнікаў дакументаў і даведнікаў.

***4. Публікацыя дакументаў і матэрыялаў. Археаграфічная камісія.*** Пытанні гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны знайшлі сваё адлюстраванне ў вялікай колькасці дакументальных зборнікаў па розным аспектам ваеннай тэматыкі. Адкрыўшыеся магчымасці па выкарыстанню новых дакументальных крыніц, у тым ліку і нямецкіх, дазволілі раскрыць многія раней невядомыя гераічныя і трагічныя старонкі вялікай вайны. Апублікаваныя дакументы, з аднога боку, спрыялі актывізацыі навуковых даследаванняў, з другога боку, паставілі перад даследчыкамі новыя пытанні, адказы на якія дазваляюцьз большай дакладнасцю і доказальнасцю падыйсці да вывучэння розных аспектаў вайны.

У 1999 г. была заснавана Археаграфічная камісія Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь. Яе функцыянаванне забяспечвае камісія Беларускага навукова–даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы. Пытанні яе дзейнасці абмеркоўваюцца на старонках часопіса «Архівы і справаводства».

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Дзе знаходзіліся асноўныя цэнтры даследаванняў па праблеме гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны?
2. Якія цяжкасці паўсталі перад сістэмай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі пасля распаду СССР?
3. У сувязі з якімі гістарычнымі падзеямі склаліся спрыяльныя магчымасці для ўвядзення ў навуковы ўжытак вялікай колькасці дакументаў па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны?
4. Якую ролю выконвае Археаграфічная камісія Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь?

**Тэма 3. Падзеі 1941 г. на тэрыторыі Беларусі ў ацэнках гістарыяграфіі.**

*Ключавыя паняцці:* атрады самаахові, знішчальныя батальёнаы, народнае апалчэнне, калабарацыянізм, Армія Краёва, антысавецкае падполле, рэпрэсіі.

**План лекцыі:**

1. Савецкая гістарыяграфія па праблеме пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.
2. Навуковыя публікацыі 1990-х – пачатку 2000-х гг.
3. Дасягненні ў вывучэнні эвакуацыйных працэсаў на тэрыторыі рэспублікі ў савецкай гістарыяграфіі.

***1. Савецкая гістарыяграфія па праблеме пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.*** Асаблівасцю большасці прац айчынных гісторыкаў па праблеме пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, выдадзеных у савецкі перыяд, была акцэнтацыя на паказ мабілізацыйнай працы партыйных і дзяржаўных органаў, дапамогі насельніцтва Чырвонай Арміі ў час абарончых баёў, дзейнасці атрадаў самаахові, знішчальных батальёнаў, народнага апалчэння, гераізму і мужнасці байцоў і камандзіраў. Гэтыя пытанні знайшлі адлюстраванне ў шэрагу манаграфій, а таксама ў першым томе фундаментальнай працы «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков».

Адметнасцю прац, падрыхтаваных айчыннымі навукоўцамі ў 1990–2000-я гг., з’яўляецца аналіз пытанняў, якія ў ранейшыя часы не даследаваліся ці асвятляліся лаканічна: няўдалыя аперацыі Чырвонай Арміі на тэрыторыі рэспублікі, лёс палонных, негатоўнасць воінскага камандавання да шырокай мабілізацыі. Прыкладам такога падыходу з’яўляецца «Беларусь в годы Великой Отечественной войны», манаграфіі, артыкулы і інш. Даследчыкамі, хоць і ўскосна, было выказана сумненне ў колькасці насельніцтва, мабілізаванага ў рады Чырвонай Арміі ў першыя месяцы вайны.

***2. Навуковыя публікацыі 1990-х – пачатку 2000-х гг.*** Пасля набыцця Рэспублікай Беларусь статусу незалежнай і суверэннай дзяржавы ў 1991 г. пачаўся новы перыяд у вывучэнні гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Значна пашырылася і стала больш рэпрэзентатыўнай крыніцазнаўчая база навуковых дасьледаваннў. Былі падрыхтаваны калектыўныя працы сумесна з навукова-даследчымі інстытутамі, грамадскімі аб’яднаннямі, замежнымі партнёрамі.

Працэс радыкальных перамен у пачатку 1990-х гг. прынёс з сабой трэнд крытычнага пераасэнсавання стану гістарычнай навукі, выпрацоўкі новых падыходаў, пунктаў гледжання, удасканалення метадаў гістарычнага даследавання. Гісторыкі імкнуліся пераадолець непахісныя ідэалагічныя штампы шляхам выдзялення разам з традыцыйнымі тэмамі новых актуальных накірункаў даследавання, якія ў савецкі час па розных прычынах заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў (праблема калабарацыянізму, дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай і антысавецкага падполля, рэпрэсіі

супраць каманднага складу Чырвонай Арміі напярэдадні вайны, пралікі ў ходзе падрыхтоўкі да вайны, страты ў Чырвонай Арміі і сярод мірнага насельніцтва пры правядзенні ваенных аперацый, трагічны лёс савецкіх салдат, якія апынуліся ў акружэнні і палоне, праца эвакуіраваных у сістэме ГУЛАГа, супрацьстаянне савецкай і нямецкай прапаганды і інш.), і абмеркавання іх на навуковых канферэнцыях, «круглых сталах» з далейшым апублікаваннем матэрыялаў.

***3. Дасягненні ў вывучэнні эвакуацыйных працэсаў на тэрыторыі рэспублікі ў савецкай гістарыяграфіі.*** Пэўных поспехаў айчынная гістарыяграфія дасягнула і ў распрацоўцы праблем эвакуацыі летам 1941 г. і ролі Камуністычнай партыі ў ажыццяўленні эвакуацыйных мерапрыемстваў, паказу працоўнага гераізму людзей у савецкім тыле, абгрунтаванню пераваг сацыялістычнай эканомікі.

Негатыўныя моманты (напрыклад, не заўсёды простыя ўзаемаадносіны мясцовага і эвакуіраванага насельніцтва), якія не ўпісваліся ў агульную станоўчую карціну, не знаходзілі адлюстравання на старонках выданняў. У наступны перыяд разам з распрацоўкай сюжэтаў пра дзейнасць у эвакуацыі прадпрыемстваў і ўстаноў, працоўны гераізм даследчыкі звярнулі ўвагу на маладаследаваныя аспекты эвакуацыйных праблем: лёс архіўных устаноў і культурных каштоўнасцяў, нацыянальныя пытанні, праца ў сістэме ГУЛАГа.

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Што было характэрна для большасці прац айчынных гісторыкаў па праблеме пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, выдадзеных у савецкі перыяд?
2. Якія змены ў асвятленні праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбыліся пачатку 1990-х гг.?
3. Якія тэмы не знаходзілі адлюстравання на старонках гістарычных выданняў?

## Тэма 4. Дасягненні і праблемы вывучэння партызанскага руху.

*Ключавыя паняцці:* «партызанскі рух», «Рух Супраціўлення», Армія Краёва, ўсенародны характар супраціўлення.

**План лекцыі:**

1. Паняцці «партызанскі рух», «Рух Супраціўлення».
2. Гісторыя партызанскай барацьбы – асноўны тэматычны блок савецкай гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны.
3. Вывучэнне гісторыі савецкага партызанскага руху ў постсавецкі перыяд.

***1. Паняцці «партызанскі рух», «Рух Супраціўлення».*** Партызанская барацьба (рух) – баявая і ўся іншая дзейнасць узброеных сіл (партызанскіх групаў, атрадаў, брыгад, злучэнняў і г.д.). Асноўнымі арганізатарамі партызанскага руху з'яўляліся камуністы і беспартыйныя актывісты, былыя воіны і камандзіры Чырвонай арміі.

Рух Супраціўлення – барацьба з акупацыйнымі ўладамі на акупаваных Германіяй і яе саюзнікамі тэрыторыях у гады Другой сусветнай вайны, а таксама ўласна ў Германіі. Рух Супраціўлення – партызанская і падпольная барацьба, масавы скрыты і адкрыты сабатаж мясцовымі жыхарамі палітыкі акупацыйных уладаў.

***2. Гісторыя партызанскай барацьбы – асноўны тэматычны блок савецкай гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны.*** Адной з найбольш актыўных формаў супраціўлення былі ўзброеныя дзеянні партызанскіх фарміраванняў. Менавіта партызанская тэматыка займала прыярытэтнае месца ў гістарыяграфіі 1940-х – 1980-х гг. Асновы для засваення тэмы былі закладзены ў перыяд вайны ў артыкулах арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху (П.К. Панамарэнкі, П.З. Калініна, Ц.С. Гарбунова, М.В. Зімяніна, І.П. Кожара, Н.Я. Наталевіча). Цэнтральнае месца ў даследаваннях айчынных гісторыкаў заняў паказ кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў арганізацыі і пашырэнні партызанскага руху на тэрыторыі рэспублікі.

Асобае месца ў гістарыяграфіі партызанскага руху займае трохтомная калектыўная праца беларускіх гісторыкаў «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков». Аўтары даследавалі пытанні станаўлення і развіцця партызанскай барацьбы і арганізацыйнай дзейнасці, структуры партызанскіх сіл, стратэгіі і тактыкі, узаемадзеяння партызанскіх фарміраванняў з часцямі Чырвонай Арміі і дапамогі савецкага тылу партызанам, жыцця насельніцтва ў партызанскіх зонах.

3. ***Вывучэнне гісторыі савецкага партызанскага руху ў постсавецкі перыяд.*** Адметнай асаблівасцю новага перыяду гістарыяграфіі гісторыі партызанскай барацьбы стала вывучэнне пытанняў, якія не атрымалі належнага асвятлення ў савецкай гістарычнай літаратуры. В.В. Барабаш, В.І. Ермаловіч, С.В. Жумар, І.І. Коўкель, І.А. Валахановіч, У.І. Гуленка, Я.І. Сямашка, А.Ф. Вішнеўскі, А.А. Прымачэнка, А.А. Каваленя, У.І. Кузьменка, А.М. Літвін звярнулі ўвагу на дзейнасць Арміі Краёвай, удзел у партызанскім руху розных катэгорый насельніцтва, прадстаўнікоў асобных нацыянальнасцяў, узаемаадносіны партызан і мясцовага насельніцтва, нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы. У 1990-я гг. праблема партызанскага руху стала прадметам дыскусіі ў розных слаях насельніцтва. Паказальнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца працы Ю. Туронка, В. Барабаша, Я. Шыраева, З. Шыбекі, В. Акудовіча, С. Захарэвіча, у якіх аспрэчваецца тэзіс пра ўсенародны характар супраціўлення на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Якая розніца паміж паняццямі «партызанскі рух» і «Рух Супраціўлення»?
2. Якімі аўтарамі і ў які перыяд вайны былі закладзены асновы для засваення тэмы партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі?
3. Якія пытанні партызанскай барацьбы не атрымалі належнага асвятлення ў савецкай гістарычнай літаратуры?

**Тэма 5. Даследаванні па гісторыі падпольнай барацьбы.**

*Ключавыя паняцці:* калабарацыянізм, антысавецкае падполле, рэпрэсіі, сістэма ГУЛАГа, арганізацыі АУН-УПА.

**План лекцыі:**

1. Канцэпцыя гісторыі Супраціўлення на тэрыторыі Беларусі.
2. Тэмы гісторыі краіны перыяду Вялікай Айчыннай вайны ва ўмовах кардынальных сацыяльна- палітычных змен пачатку 1990-х гг.
3. Нацыяналістычнае падполле. Арганізацыі АУН-УПА.

***1. Канцэпцыя гісторыі Супраціўлення на тэрыторыі Беларусі.*** У савецкі перыяд асаблівае значэнне надавалася кіруючай ролі Камуністычнай партыі, якая забяспечыла адзінства кіраўніцтва барацьбой з захопнікамі. Згодна з афіцыйнай канцэпцыяй гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, асноўная ўвага павінна быць сканцэнтравана на асвятленні толькі поспехаў, перамог, гераізму і подзвігаў, пры гэтым трэба пазбягаць згадак пра паражэнні, няўдачы, пралікі і іх наступствы. Айчыннымі гісторыкамі М.М. Акаловічам, М.К. Андрушчанкам, П.П. Ліпілам, В.П. Раманоўскім, Я.С. Паўлавым, І.С. Краўчанкам, Р.Ц. Аблавай, А.І. Залескім, А.Ф. Хацкевічам, Р.Р. Кручком, У.І. Лемяшонкам, А.А. Фактаровічам, Г.А. Шубіным, А.А. Тозікам і інш. былі падрыхтаваны працы, якія да сённяшняга дня не страцілі сваёй навуковай каштоўнасці.

***2. Тэмы гісторыі краіны перыяду Вялікай Айчыннай вайны ва ўмовах кардынальных сацыяльна-палітычных змен пачатку 1990-х гг.*** Працэс радыкальных перамен у пачатку 1990-х гг. прынёс з сабой трэнд крытычнага пераасэнсавання стану гістарычнай навукі, выпрацоўкі новых падыходаў, пунктаў гледжання, удасканалення метадаў гістарычнага даследавання. Гісторыкі імкнуліся пераадолець непахісныя ідэалагічныя штампы шляхам выдзялення разам з традыцыйнымі тэмамі новых актуальных накірункаў даследавання, якія ў савецкі час па розных прычынах заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў (праблема калабарацыянізму, дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай і антысавецкага падполля, рэпрэсіі супраць каманднага складу Чырвонай Арміі напярэдадні вайны, пралікі ў ходзе падрыхтоўкі да вайны, страты ў Чырвонай Арміі і сярод мірнага насельніцтва пры правядзенні ваенных аперацый, трагічны лёс савецкіх салдат, якія апынуліся ў акружэнні і палоне, праца эвакуіраваных у сістэме ГУЛАГа, супрацьстаянне савецкай і нямецкай прапаганды і інш.), і абмеркавання іх на навуковых канферэнцыях, «круглых сталах» з далейшым апублікаваннем матэрыялаў.

*3. Нацыяналістычнае падполле. Арганізацыі АУН-УПА*. У незалежнай Беларусі прыярытэтнае значэнне набылі раней закрытыя тэмы гісторыі краіны перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У першую чаргу гэта тычыцца нацыяналістычнага падполля. Асаблівая ўвага надавалася ўкраінскаму нацыяналістычнаму падполлю, і найперш арганізацыям АУН-УПА. Прыярытэтнае значэнне набылі такія раней закрытыя тэмы, як дзейнасць на тэрыторыі рэспублікі польскіх, украінскіх, літоўскіх падпольных фарміраванняў (Ю.В. Чарняк, У.І. Гуленка, В.І. Ермаловіч, С.А. Сільвановіч, Н.А. Рыбак, І.А. Валахановіч). Асаблівае значэнне надавалася вывучэнню гісторыі арганізацый АУН-УПА, што ў значнай ступені было выклікана дыскусіямі, якія адбыліся ва Украіне.

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Якая канцэпцыя гісторыі Супраціўлення на тэрыторыі Беларусі дамінавала ў савецкі перыяд?

2. Якія новыя актуальныя накірункі даследаванняў з'явіліся ў часы радыкальных перамен у пачатку 1990-х гг.?

3. Якія раней закрытыя тэмы набылі прыярытэтнае значэнне ў незалежнай Беларусі?

## Тэма 6. Агітацыя і прапаганда ў гістарычнай літаратуры.

*Ключавыя паняцці:* прапаганда на акупаванай тэрыторыі, антысавецкія ваенна-паліцэйскія фарміраванні, калабарацыя,

**План лекцыі:**

1. Напрацоўкі савецкага перыяду ў вывучэнні агітацыі і прапаганды на акупіраванай тэрыторыі: дзейнасць прапагандысцкага апарату акупацыйнай улады, супрацьстаянне савецкай і нямецкай прапаганды, формы і метады работы савецкіх прапагандыстаў у асяроддзі антысавецкіх ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі.
2. Характэрныя асаблівасці постсавецкай гістарыяграфіі.

***1. Напрацоўкі савецкага перыяду ў вывучэнні агітацыі і прапаганды на акупіраванай тэрыторыі: дзейнасць прапагандысцкага апарату акупацыйнай улады, супрацьстаянне савецкай і нямецкай прапаганды, формы і метады работы савецкіх прапагандыстаў у асяроддзі антысавецкіх ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі.*** Айчынныя гісторыкі дасягнулі пэўных поспехаў у вывучэнні пытанняў ідэалагічнага супрацьстаяння, агітацыі і прапаганды гітлераўскай Германіі і СССР на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Асаблівасцю літаратуры, выдадзенай у 1940-я – 1980-я гг., з'яўляецца відавочная акцэнтацыя на даследаванні ідэйна-палітычнай дзейнасці Кампартыі Беларусі. Агульнай для прац І.С. Краўчанкі, І.І. Сачанкі, М.Е. Дастанкі, П.М. Кобрынца, У.І. Лемяшонка, А.А. Кавалені, В.З. Протчанкі, Л.М. Хухлындзінай, В.М. Шэіна, Г.Д. Кнацько, С.С. Рудзянковай з'яўляецца выснова аб тым, што дзейснасць савецкай прапаганды распаўсюджвалася не толькі на байцоў

Чырвонай Арміі, але і на салдат праціўніка. На старонках выданняў знаходзілі адлюстраванне выключна станоўчыя аспекты працы агітацыйна-прапагандысцкай сістэмы СССР, а недахопы і негатыўныя моманты замоўчваліся.

*2. Характэрныя асаблівасці постсавецкай гістарыяграфіі.* У постсавецкі перыяд асноўная ўвага даследчыкаў была накіравана на аналіз тых праблем, якія не знайшлі грунтоўнага асвятлення ў савецкай гістарыяграфіі. Новыя падыходы ў вывучэнні барацьбы і супрацьстаяння савецкай і нямецкай прапаганды на акупіраванай тэрыторыі Беларусі знайшлі адлюстраванне ў працах А.А. Мігуновай, Г.А. Болсун, А.А. Кавалені, А.М. Літвіна, С.У. Жумара, А.В. Касовіча, М.Г. Жылінскага, у калектыўным выданні «Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг.».

Праблема калабарацыянізму ў савецкай гістарыяграфіі не атрымала шырокага асвятлення. У савецкі час тэрмін «калабарацыя» ўжываўся пераважна для характарыстыкі з'явы ў заходнееўрапейскіх краінах. Што да асвятлення рэаліяў германскай акупацыі тэрыторыі СССР, то часта без вызначэння абставін і матываў усе тыя, хто супрацоўнічаў з акупантамі, былі залічаны ў разрад саўдзельнікаў у злачынствах і здраднікаў.

Увядзенне ў навуковы ўжытак новых дакументаў і матэрыялаў, выкарыстанне сучасных метадаў даследавання дазволілі айчынным гісторыкам адысці ад агульна-абвінаваўчай танальнасці ў вывучэнні тэмы супрацоўніцтва з германскімі ўладамі. Аўтары выдзяляюць палітычную, эканамічную і ваенную калабарацыю. На практыцы калабарацыя ўяўляла сабой ідэйнае супрацоўніцтва (палітычныя і грамадскія аб'яднанні, арганізацыі і г.д.), свядомае супрацоўніцтва з карыслівага матэрыяльнага разліку (служба ў разнастайных органах) і прымусовае супрацоўніцтва (праца ў адміністрацыйна-гаспадарчых органах і на прадпрыемствах). У нешматлікіх працах без дастатковай аргументацыі калабаранты паказаны не толькі як саюзнікі нацысцкай Германіі, але і як змагары за адраджэнне нацыянальнай культуры і беларускай дзяржаўнасці.

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Якія працы па праблеме вывучэння пытанняў ідэалагічнага супрацьстаяння, агітацыі і прапаганды гітлераўскай Германіі і СССР на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, выйшлі ў дасавецкі перыяд?
2. Аналіз якіх праблем стаў прыярытэтным у постсавецкай гістарыяграфіі?

## Тэма 7. Ураджэнцы Беларусі на франтах вайны і ў еўрапейскім руху Супраціўлення: напрамкі і перспектывы вывучэння.

*Ключавыя паняцці:* ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, еўрапейскі рух Супраціўлення,

### План лекцыі:

1. Тэма ўдзелу Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў у савецкі перыяд.

2. Праблемы ўдзелу жанчын у ратнай справе, баявыя дзеянні ураджэнцаў Беларусі ў складзе іншых воінскіх фарміраванняў у постсавецкі перыяд.
3. Тэма барацьбы суайчыннікаў за мяжой, у еўрапейскім руху Супраціўлення ў савецкай і постсавецкай айчыннай гістарыяграфіі.

***1.Тэма ўдзелу Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў у савецкі перыяд.*** У айчынных даследчыкаў назапашаны пэўны матэрыял па гісторыі ўдзелу ўраджэнцаў Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Арыентацыя беларускай савецкай гістарыяграфіі на даследаванне партызанскага і падпольнага руху часам не спрыяла грунтоўнаму і ўсебаковаму вывучэнню гэтай тэмы. У пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР», «Очерках истории Коммунистической партии Белоруссии», трохтомніку «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны», артыкулах Э.Р. Іофе, В.М. Шымука, В.К. Якавенкі, М.Р. Розума, М. Салаўёва, А.Ф. Хацкевіча асноўная ўвага сканцэнтравана на паказе гераізму і мужнасці чырвонаармейцаў і афіцэраў на савецка-германскім фронце. Згодна з афіцыйнымі ўстаноўкамі, франтавая дзейнасць паказвалася ў рэчышчы мабілізацыйнай працы Камуністычнай партыі.

***2.Праблемы ўдзелу жанчын у ратнай справе, баявыя дзеянні ураджэнцаў Беларусі ў складзе іншых воінскіх фарміраванняў у постсавецкі перыяд.*** Асэнсаванне разнастайных аспектаў вайны з пазіцый мікраўзроўню спрыяла далейшаму вывучэнню жаночай тэматыкі. Пытанні ўдзелу жанчын у падпольнай і партызанскай барацьбе, на франтах Вялікай Айчыннай вайны раскрываюцца ў працах І.У. Нікалаевай, К.І. Козака, Д.А. Козела.

***3. Тэма барацьбы суайчыннікаў за мяжой, у еўрапейскім руху Супраціўлення ў савецкай і постсавецкай айчыннай гістарыяграфіі.*** Арыентацыя беларускіх даследчыкаў на вывучэнне ў першую чаргу партызанскай і падпольнай барацьбы, страта часткі дакументаў і недаступнасць значнай часткі архіўных фондаў уплывалі на тое, што праблема ўдзелу ўраджэнцаў Беларусі ў еўрапейскім руху Супраціўлення распрацавана ў значна меншай ступені. У традыцыйных для айчыннай гістарыяграфіі артыкулах Я. Семяжона, Р. Сямёнава, В. Марутка, Т.А. Паповай-Маневіч, І. Мазура, П. Тормасава, Я. Рэзнікава, І. Лешанюк, С. Гладкага, А. Уса, М. Даніленка, М. Цітова, М. Цвікевіча, А.І. Котава, У.П. Паўлава раскрываюцца асобныя аспекты змагання беларусаў за мяжой. У нешматлікіх калектыўных выданнях – «Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945», пяты том «Гісторыі Беларусі» – дадзенай тэме адведзены невялікія асобныя раздзелы.

***Кантрольныя пытанні для самападрыхтоўкі студэнтаў:***

1. Што не спрыяла грунтоўнаму і ўсебаковаму вывучэнню тэмы ўдзелу Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў у савецкі перыяд?

2. У працах якіх даследчыкаў вывучаюцца пытанні ўдзелу жанчын у падпольнай і партызанскай барацьбе, на франтах Вялікай Айчыннай?

3. Што з’яўлялася прычынай недастатковай распрацаванасці праблемы ўдзелу ўраджэнцаў Беларусі ў еўрапейскім руху Супраціўлення?

**Тэма 8. Вызваленне Беларусі, першыя аднаўленчыя работы: асвятленне праблемы навукоўцамі.**

*Ключавыя паняцці:* людскія страты ў Вялікай Айчыннай вайне, Надзвычайная дзяржаўная камісія, остербайтары.

**План лекцыі:**

1. Савецкая гістарыяграфія па праблеме вызвалення Беларусі ад акупантаў.
2. Далейшае вывучэнне заяўленых тэм у 1990-я – пачатку 2000-х гг.
3. Праца па вызначэнню колькасці загінуўшых жыхароў Беларусі.
4. Даследаванне пытанняў па аднаўленню народнай гаспадаркі рэспублікі. Асаблівасці савецкага і постсавецкага перыядаў гістарыяграфіі.

***1. Савецкая гістарыяграфія па праблеме вызвалення Беларусі ад акупантаў.*** Айчынная гістарычная навука мае значныя здабыткі ў вывучэнні розных аспектаў вызвалення Беларусі ад акупантаў. У адпаведнасці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі і задачамі ваенна-патрыятычнага выхавання намаганні гісторыкаў былі накіраваны на паказ поспехаў наступальных аперацый, гераізму салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў пры вызваленні тэрыторыі Беларусі ад акупантаў. Асаблівая ўвага надавалася аперацыі «Баграціён», якая падавалася як узор спалучэння стратэгіі і тактыкі. Гэтая канцэпцыя знайшла адлюстраванне ў трохтомніку «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны», у манаграфіях М.М. Акаловіча, Ю.В. Плотнікава, у даследаваннях Я.С. Паўлава, К.М. Гоцман, В.К. Кісялёва, Б.Д. Далгатовіча і інш. У прыватнасці, няўдалыя аперацыі Заходняга фронта, праведзеныя ў кастрычніку 1943 г. – красавіку 1944 г., практычна не вывучаліся.

2. ***Далейшае вывучэнне заяўленых тэм у 1990-я – пачатку 2000-х гг.*** Тэма вызвалення Беларусі ад акупантаў актыўна вывучалася і ў постсавецкі перыяд. Характэрнай рысай новага перыяду гістарыяграфіі з’яўляецца тое, што ў тэмах, заяўленых раней, з’явіліся новыя ракурсы і аспекты. І.В. Цімаховіч, У.І. Лемяшонак, А.М. Літвін, І.А. Літвіноўскі, А.А. Каваленя, У.І. Кузьменка, В.Ф. Кушнер, Я.С. Паўлаў звярнулі ўвагу на пралікі і недахопы, кошт праведзеных аперацый па вызваленні рэспублікі, у тым ліку і тых, якія закончыліся беспасяхова для савецкага камандавання.

***3. Праца па вызначэнню колькасці загінуўшых жыхароў Беларусі.*** Адным са складанейшых пытанняў Вялікай Айчыннай вайны з’яўляецца пытанне аб колькасці знішчанага насельніцтва Беларусі. Разнастайныя методыкі падліку страт, якія выкарыстоўваюцца даследчыкамі, даюць супярэчлівыя лічбы. У поўнай меры гэта мае дачыненне і да падліку страт на

тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюза. У значнай ступені дадзеныя, якія падаюцца ў розныя перыяды, залежалі не ад намаганняў гістрыкаў, а ад палітычнай каньюктуры. Так, І.В. Сталін у лютым 1946 г. назваў 7 млн чалавек, М.С. Хрушчоў – звыш 20 млн савецкіх людзей, М.С. Гарбачоў – амаль 27 млн савецкіх людзей.

Павелічэнне лічбаў страт СССР у гады вайны стала своеасаблівым каталізатарам для перагляду колькасці загінуўшых у Беларусі. У савецкай гістарыяграфіі падавалася, што рэспубліка страціла 2 млн 200 тысяч чалавек – г.зн. кожнага чацьвёртага. Даденая лічба ўпершыню была прыведзена Надзвычайнай дзяржаўнай камісіяй у канцы 1944 г. Аднак, па-за ўвагай членаў камісіі засталіся остербайтары, а таксаматыя, хто загінуў і памёр на франтах, у эвакуацыі, у тыле, у сістэме ГУЛАГа. Адначасова ў публіцыстычных і навуковых выданнях з’явіліся новыя дадзеныя людскіх страт у Беларусі. Лічбу 3 млн падаюць аўтары калектыўнай працы «Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941-1945 гг.».

***4. Даследаванне пытанняў па аднаўленню народнай гаспадаркі рэспублікі. Асаблівасці савецкага і постсавецкага перыядаў гістарыяграфіі.*** За пасляваенны перыяд навукоўцамі асветлены шырокі і мнагапланавы спектр пытанняў, звязаных з аднаўленчай праблематыкай. Асаблівая ўвага ў даследаваннях надавалася ролі Камуністычнай партыі ў рашэнні пытанняў аднаўлення. Акцэнтацыя ўвагі на паказе прааў і пераваг сацыялістычнай сістэмы, ухіл у бок падкрэслівання поспехаў садзейнічалі таму, што многія сюжэты наогул засталіся па-за ўвагай даследчыкаў.

